Источник: **«Звязда» - 2012-06-26**

## Уладзімір Гілеп: "Краязнаўцы вяртаюць нам згубленую памяць"

**Менавіта гэтыя словы майго суразмоўцы я вырашыла ўзяць у якасці загалоўка. Хоць рэдактар "Краязнаўчай газеты" Уладзімір Гілеп так назваў толькі першыя нумары газеты, якая, дарэчы, ужо крочыць да свайго юбілею. Першы нумар "Краязнаўчай газеты" выйшаў у 2003 годзе. А хіба не баявое выданне, якое аб'ядноўвае нястомных вандроўнікаў, аматараў-даследчыкаў, што дбаюць пра захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, якія шчыруюць над зборам звестак пра сваю малую радзіму, у рэшце рэшт, змагаюцца з часам, бо стараюцца запісаць успаміны людзей сталага веку і для будучыні захаваць гістарычныя факты?**

— Ідэя аб'яднаць беларускіх краязнаўцаў узнікла 25 гадоў таму, калі яшчэ існавала беларускае аддзяленне савецкага фонду культуры. У 1988 годзе было створана краязнаўчае таварыства, старшынёй якога стаў Генадзь Каханоўскі. Гэта аб'яднанне было вельмі моцна "завязана" на старшыню як вельмі актыўнага чалавека і выдатнага краязнаўцу. Калі Генадзь Каханоўскі памёр, не стала і таварыства... Але сама ідэя аб'яднання краязнаўцаў захавалася. Вось і вырашана было выпускаць газету як аб'яднаўчы орган краязнаўцаў, — распавядае Уладзімір Гілеп.— Ствараць газету было складана: ні я, ні маё атачэнне ніколі не займаліся газетнай справай. Першыя нумары я нават назваў бы "баявым лістком" краязнаўства. Мне падавалася, што гэта яшчэ не газета.

У 2003-2005 гадах пачалі з'яўляцца ў бібліятэках аддзелы краязнаўства, у школах краязнаўства стала вывучацца больш сур'ёзна. Пачалі выходзіць краязнаўчыя бюлетэні мясцовага ўзроўню, якія выдаваліся саматужна, маленькімі тыражамі. Патрэбен быў нейкі орган, які б дапамагаў, даваў інфармацыю пра тое, што робіцца ў іншых рэгіёнах. І нам удалося наладзіць гэтую сувязь. Але мы імкнуліся зрабіць газету не толькі для тых сталых краязнаўцаў, якія маюць багаты вопыт, але і для моладзі, для школ.

**- Ці змянілася краязнаўства, калі інфармацыя пачала распаўсюджвацца?**

— Краязнаўцы (а іх у краіне многа) узрадаваліся, калі з'явілася газета, бо да таго ў іх не было выхадаў адзін да аднаго. Да "Краязнаўчай газеты" адразу пацягнуліся людзі, пачалі "закідваць" сваімі кніжкамі. Як аказалася, у нас выдаецца нямала краязнаўчай літаратуры, аўтары распавядаюць пра свае раёны, вёскі. Гэта каштоўны матэрыял даследавання канкрэтнай мясцовасці: многае з таго, што збіраюць краязнаўцы, у архівах не знойдзеш. Важна, каб усё гэта захавалася. Але калі такія кнігі выходзяць тыражом у сто асобнікаў, яны не трапляюць нават у Нацыянальную бібліятэку. Мне падаецца, павінна быць створана пэўная сістэма працы з такімі аўтарамі.

Сёння краязнаўцы ўжо выпускаюць больш аб'ёмныя кнігі (Уладзімір Аляксандравіч паказвае кнігу ў 486 старонак). Гэта адна з апошніх прац Мікалая Гладкага, нашага пастаяннага аўтара. Яна распавядае пра гісторыю ўсяго адной вёскі Навагрудскага раёна — уся гісторыя вёскі за 510 гадоў, пачынаючы з першага ўпамінання. І напісаў такую кнігу не вучоны, а інжынер-будаўнік, чалавек, які проста хацеў вывучыць сваю вёску, свой радавод, а ў выніку атрымалася такое цікавае даследаванне.

Мы сабралі звесткі пра ўсіх краязнаўцаў нашай краіны. У газеце пачала выходзіць спецыяльная калонка, дзе расказвалася пра гэтых людзей. У нашым дасье інфармацыя

больш чым пра 500 чалавек. І гэта толькі краязнаўцы са стажам, не ўлічваючы пачаткоўцаў. У нас ёсць задума выдаць кнігу, якая распавядала б пра краязнаўцаў Беларусі. Такі прыклад ужо ёсць у Віцебскай вобласці.

На працягу 9 гадоў, як выдаецца "Краязнаўчая газета", павялічылася колькасць публікацый па краязнаўстве і ў іншых газетах. Дарэчы, многія аўтары, якія пачыналі працаваць у "Краязнаўчай газеце", сёння журналісты рэспубліканскіх выданняў.

***— Яшчэ адна місія "Краязнаўчай газеты" — падтрымка роднай мовы.***

— Сапраўды, напачатку нават з боку краязнаўцаў быў ціск, каб газета выходзіла на дзвюх мовах: маўляў, многім зручней пісаць па-руску. Але мы адразу заявілі, што без роднай мовы не можа быць беларускага краязнаўства.

Мы вельмі ўважліва ставімся да мовы, імкнёмся, каб гэта была сучасная беларуская мова, але ў той жа час не адарваная ад мясцовасці, пра якую распавядаецца ў пэўных тэкстах. Мы даруем нашым аўтарам схільнасці да мясцовых гаворак, інтэрпрэтацый таго ці іншага слова, бо краязнаўства павінна гэта ўлічваць.

***— За час, што існуе газета, ёй удалося выратаваць некаторыя гістарычныя помнікі?***

— Наадварот некаторыя помнікі былі разбураны, нягледзячы на намаганні газеты. Напрыклад, у Слуцку быў знесены вельмі цікавы помнік — будынак старой бальніцы. Горад рыхтаваўся да свята, і на гэтым месцы вырашана было пабудаваць новую лазню... Гэта толькі адзін з прыкладаў неразумнага падыходу... На жаль, мала хто сочыць за захаваннем помнікаў. Гэты пасыл я скіроўваю да Міністэрства культуры: яно павінна намагацца, каб у штабы па падрыхтоўцы да свята быў уключаны чалавек, які будзе адсочваць пытанні захавання помнікаў, і мы спадзяёмся, што праблема будзе вырашана.

***— "Краязнаўчая газета" карысная і для тых, хто збіраецца ў вандроўку па Беларусі?***

— Безумоўна, многія экскурсаводы выпісваюць нашу газету: бо з яе публікацый можна вылучыць цікавы матэрыял. Але кожны, хто пачытае газету, можа і сам скарыстаць інфармацыю і накіравацца ў падарожжа — тым больш што мы на працягу некалькіх гадоў друкавалі краязнаўчыя маршруты.

***— А з чым звязана абуджэнне цікавасці да краязнаўства?***

— Былі зняты некаторыя забароны, і мы пачалі адкрываць для сябе раней невядомыя старонкі гісторыі. Нават не пра ўсіх сваіх продкаў людзі маглі расказваць. Напрыклад, пры паступленні ў ВНУ я павінен быў напісаць аўтабіяграфію, дзе выкласці, што я не з багатых, не са шляхты, не з паноў, што мой бацька з сялян, што за мяжой ніхто з блізкіх не жыве, што я — свой, я — наш, я — лапатны.

У час перабудовы гэтая насцярога пачала паступова сыходзіць. Цікавая з'ява: раптам людзі пачынаюць распавядаць, што яны са шляхты, дваранства, баярства. І гэта дало штуршок для абуджэння цікавасці. Вельмі многія пачалі задумвацца: "А хто я?" Такое пытанне задаў сабе і я. І ў архіве знайшоў, што я хоць і бедны, але пан, што жылі мае продкі небагата, але дастатак мелі: трымалі трох парсюкоў, дзвюх кароў, двух коней,

дзясятак авечак. Мне было цікава, а як жа жылі астатнія жыхары вёскі, і я знайшоў шмат матэрыялу.

***— І атрымалася, што імідж продкаў беларусаў як бедных, галодных, лапатных, гэта міф?***

— Пра гэта сведчаць рэвізскія перапісы, дзе падаецца дакладная інфармацыя, пералічваецца ўсё, што мелі людзі. Але не трэба забывацца, што ўмовы жыцця прымушалі чалавека апранацца ў традыцыйнае адзенне, карыстацца традыцыйнымі прыладамі працы. Сапраўды, тады не хадзілі ў ботах, хадзілі ў лапцях, таму што трэба было араць, касіць на поплаве, дзе вада стаіць. Безумоўна, у той час былі і бедныя людзі. А хіба зараз няма?

***— Наколькі важная праца, якую робяць краязнаўцы?***

— Краязнаўцы вяртаюць нам згубленую памяць, прычым не толькі пра людзей, але і пра населеныя пункты. 5 гадоў таму ў "Краязнаўчай газеце" быў размешчаны артыкул аб вёсках, якія зніклі як у вайну, так і ў пасляваенныя гады. Што робіцца ў тых мясцінах? Ці адзначана як-небудзь, што тут жылі людзі. Пра тыя вёскі нагадваюць могілкі. Ці прыбіраюцца яны? Ці можна там прачытаць прозвішчы жыхароў? Пасля першай публікацыі з'явіліся і іншыя. У тым ліку ў "Звяздзе" ішло абмеркаванне, а праз паўгода краязнаўцы з Вілейскага раёна запрасілі мяне на адкрыццё помніка зніклай вёсцы...

***— Ці можна вырасціць краязнаўцаў у гарадскіх умовах?***

— Можна. Вельмі многія з тых, хто сёння жыве ў горадзе, самі або іх бацькі з вёскі. Дзеці, калі праглядаюць старыя здымкі сямейных архіваў, цікавяцца: хто на іх. З гэтага пачынаецца краязнаўства ў гарадскіх школах. Сёння ў гарадах ужо ёсць школы, якія ствараюць краязнаўчыя музеі на матэрыялах, звязаных з бацькамі, дзядамі сваіх вучняў. Напрыклад, так ствараўся музей у сярэдняя школе № 1 горада Слуцка. Пазней былі знойдзены праекты будаўніцтва школы і з'явілася ідэя зрабіць у будынку старой школы клас, афармлены так, як гэта было ў XIX стагоддзі, — з тымі шафамі, партамі, чарнілам, літаратурай. І ў гэтым класе будуць ісці заняткі, вучні нават пачнуць спаборнічаць паміж сабой за права вучыцца ў гэтым памяшканні. Безумоўна, гэта пакуль толькі мая мара аб будучым школы, якую скончыў у 1955 годзе.

Наогул, сёння ў школах створана 2000 краязнаўчых музеяў. Але, на жаль, школа практычна не выпісвае "Краязнаўчую газету". У падручніках няма шырокай інфармацыі, што здабываецца даследчыкамі-аматарамі. А патрыётаў у наш час можна выхоўваць на краязнаўстве: яно можа расказаць пра гісторыю мясцовасці, пра продкаў і знакамітасцяў. Так абуджаецца любоў да свайго краю. У нумары за 28 лютага 2012 года ў "Звяздзе" была надрукавана гутарка з акадэмікам-сакратаром Аддзялення гуманітарных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандрам Каваленем "Работа па краязнаўстве будзе паспяховай, калі ёсць падзвіжнікі". Падтрымліваю прапанову пра неабходнасць выкладання факультатыву па краязнаўстве ў кожнай беларускай школе.

**Алена Дзядзюля.**